Дзяржаўная установа адукацыі
“Сярэдняя школа № 21 г.Магілёва”

*Міжнароднаму дню беларускай мовы прысвячаецца…*

# “МОВУ РОДНУЮ СВАЮ ДОБРА ВЕДАЮ Я І ЛЮБЛЮ”

гульня-падарожжа ў 2 класе

**Стваральнікі,**
**настаўнікі пачатковых класаў:**
Садоўская І.Л.
Суднэка В.К.
Саладаева Т.Л.
Ісакава Г.К.
Жылавачык А.П.

Магілёў
2024

**Гульня-падарожжа “Мову родную сваю добра ведаю я і люблю.”**

**Мэта:** абуджэнне павагі да роднага слова, імкнення захоўваць рультуру нашых продкаў.

**Задачы:**

- развіваць пазнавальны інтарэс школьнікаў;
- выхоўваць нацыянальную самасвядомасць і любоў да роднай мовы;
- садзейнічаць фарміраванню беларускамоўнага слоўнікавага запасу дзяцей.

**Ход мерапрыемства:**

Добры вам дзень! Добры вам дзень!
Добрыя словы – добрым людзям.
Давайце па дзесяць разоў (не радзей)
Сустрэчным усім гаварыць іх будзем.
Добры вам дзень! Добры вам дзень!
Усім незнаёмым кажыце, дзеці.
Тады будзе многа цяпла і надзей,
Тады ўсе шчаслівымі будуць на свеце.
Добры вам дзень! Добры вам дзень!
Добрыя словы – шчырыя словы.
Родныя словы для родных людзей.
Словы маёй беларускай мовы.

(Н.Нарэйка)

Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе. Хто забыў сваю мову – усё згубіў. 21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. І менавіта пра нашу Радзіму – Беларусь, і пра нашу родную мову мы сёння павядзём гаворку. Ці ведаеце вы, што беларуская мова, згодна даследаванням, з’яўляецца самай мілагучнай у свеце пасля італьянскай.

Беларуская мова – гэта дзяржаўная мова беларусаў. Наша родная мова самая прыгожая і вельмі мілагучная. Яна – нібы спеў салаўя, яна цеплая, як матуліна пяшчота.

Кожны чалавек павінен ведаць гісторыю сваёй Радзімы. І таксама павінен любіць сваю мову.

Менавіта пра гэта верш Леаніда Пранчака **“Цік-так ходзікі”.**

П ‘ем гарачую гарбату
З мёдам майскім у прыкуску
І мяне бабуля вучыць

Размаўляць па беларуску.
Цік-так ходзікі
Мне чатыры годзікі,
Чуб ільняны, светларусы.
Тата з мамай – беларусы.
За бабуляй паўтараю
Што ні словы быццам песня –
Белавежжа, Навагрудак,
Нарач, Вязынка, Палессе.
Словы родныя люблю я
Вершаў ведаю багата,
Гукі мовы беларускай
Пахнуць верасам і мятай.

Зараз я запрашаю вас у падарожжа ў мінулае нашага краю. Калі вам хочацца ведаць, як жылі вашы продкі, пра што марылі, звярніцеся да народнай творчасці — люстэрка жыцця народа. Песні і казкі, прыказкі і прымаўкі, легенды і паданні, жарты і загадкі роднага краю... Колькі ў іх глыбокай мудрасці і высокай паэзіі, колькі святла душы таго, хто іх ствараў, — душы працоўнага люду. Давайце разам перанясёмся ў цудоўны свет першароднага мастацтва, аўтар якога — наш беларускі народ.

Як чутно, дык гэта, мусіць,
Ў нас на цэлай Беларусі
Кожны двор і кожна хата
Мае прыказак багата.
А спісаць іх усе з натуры,
Дык валовай мала скуры.
Але прыказкі ўсе гэты
Не ліхой бываюць мэты:
Іх прымеціць толькі штука,
А там кожнаму навука.

Разам з народам ***прыказкі і прымаўкі*** праходзілі доўгі шлях развіцця. Паміралі людзі, адыходзілі ў нябыт старыя прылады працы, з'явы, а прыказкі і прымаўкі працягвалі жыць, асвятляючы дарогу наступным пакаленням сваёй мудрасцю. Ёсць такія аматары прыказак, якія ледзь не кожны свой крок апраўдваюць прыказкаю, ледзь не кожны свой сказ аздабляюць ёю. Пра іх

кажуць; "***Без прыказкі і з лаўкі не зваліцца***". А ці ёсць сярод вас знаўцы прыказак?

Добрая прыказка:
Як пры мяшку прывязка.
Хто прыказку скажа
— Мяшок вузлом завяжа.
Хто ўкраў парася,
У таго ў вушку пішчыць.
Вось і прыказка ўся
— Не трэба доўга вучыць.

Праводзіцца ***конкурс*** на лепшыя ***прыказкі, прымаўкі***.

Чужое дабро вылазіць праз рабро.
Як умею, так пяю.
Сваю песню, не тваю.
А ты свае песні
Спявай сам, хоць трэсні.
Не зыч ліха другому, каб не давялося самому.
Хто працуе, той не сумуе.
Адна пчала мёду не наносіць.
Хто да сонца ўстае,
Таму Бог дае.
Гультай за работу, а мазоль за руку
Усё мінецца, а праўда застанецца.
Адным пальцам вузла не завяжаш.

***Загадкі*** любяць усе. У невялікай, але высокапаэтычнай форме яны адлюстроўваюць гаспадарчую і працоўную дзейнасць чалавека, яго жыццёвы вопыт, працу, быт, раслінны і жывёльны свет. Яны вучаць думаць, развіваюць кемлівасць, фантазію. Давайце зараз даведаемся з вамі па ***загадкі.***

Кожная сялянская хата мае сваю гаспадарку. Калі вы адгадаеце ўсе загадкі, то даведаецеся, хто жыве на двары.

Колькі вас усіх тут ёсць,
Кожнаму дам па зярнятку,
Кожны дарагі мой госць
Хай паслухае загадку:
Стаіць на плоце
У чырвоным капоце,
Рана ўстае,

Спаць не дае.
(Певень.)
З людзьмі сябруе,
Хату вартуе,
Жыве пад ганкам,
Хвост абаранкам.
(Сабака.)
Не араты, не каваль, не плотнік,
А першы на сяле работнік.
(Конь.)
Пасярод двара стаіць тара,
Спераду вілы, ззаду мятла.
(Карова.)
Цэлы дзень у рэчцы купаюцца,
А на бераг сухія выходзяць.
(Гусі.)
Па зямлі ходзіць,
Неба не бачыць,
Нічога не баліць,
А ўсё стогне.
(Свіння.)
Лыка дзярэ, а лапці не пляце.
(Каза.)
На полі і ў лузе
Ходзіць у кажусе.
(Авечка.)

З чаго пачынаецца сонечны дзень? Вядома, з новай ***казкі.***
У казках і грушы растуць на вярбе.
Грамаце вучыць варона сароку.
Гавораць, знайшоўся адзін верабей,
Што возера выпіў у спёку.

***Казкі*** сеюць зерне мудрасці — так кажуць у народзе. А хто не захапляўся імі? Хто з вас можа нагадаць нам якую-небудзь казку?

Давай палічымся, каму першаму пачынаць.
Опа, опа, опа,
Амерыка, Еўропа,
Азія, Афрыка, Індыя,
Кітай...

А дзе наш край?
Павядзі да мяжы
І ўсім дзецям пакажы.
Вось яна — відна здаля
Беларуская зямля.

Праводзіцца ***конкурс"Лепшы знаўца казак".*** Дзеці называюць казку аўтара па ўрыўках.
Была ў цара адна нага,
Нібы зламаная дуга,
І вока выперла на лоб...
Не цар, крый божа, а цыклоп!
(А. Грачанікаў. "Казка пра Івана-Ганчара і пачвару цара".)

Жыў-быў хлапчына
З васільковымі вачыма,
Сам высокі, спрытны, стройны,
Да работы ўсякай здольны.
(У.Дубоўка. "Мілавіца".)

Хто ведае казку пра селяніна, здаровага, як зубр, добрага, але не дужа мудрага. У яго было 50 сыноў, 40 валоў і кошка. (У. Караткевіч. "Чортаў скарб")

Хутка казка расказваецца, ды не хутка справа робіцца. Пайшлі ў лазню, адчынілі дзверы, бачаць — ляжыць на палку хло¬пец. Сам абадраны, шапка на лоб насунута... і так грае на жалейцы, што ногі самі ў скокі ідуць... ("Бацькаў дар".)

Хвост трымае ён трубой.
Захапляецца сабой.
У паходах, у турботах
Ваш знаёмы...
(Ш. Перо. "Кот у ботах".)

Ішла да бабулі дзяўчынка
Знаёмай лясною сцяжынкай.
І кожнае дрэўца дзяўчынка вітала,
Ды раптам яна ваўка напаткала.

(Ш. Перо. "Чырвоная Шапачка".)

У гасцях добра, а дома лепей. Добрага вам здароўя. Дзякуй за бяседу, паедзем да другога суседа. Дзеці, мы заўседы рады гасцям. Але сёння наша падарожжжа заканчваецца. Да пабачэння! Да новых сустрэч!

***Літаратура:***

1.Аксамітаў А. Прыказкі і прымаўкі. — Мінск - Бел. навука, 2002.
2.Галубовіч Я. Ад студзеня да студзеня: Каляндар прыроды: для дзяцей сярэд. шк. узросту. — Мінск Асар, 2003.
3.Жыццядайныя крыніцы: Легенды і паданні: для дзяцей малод. і сярэд. шк. узросту / мастак Я. А. Ларчанка. — Мінск: Юнацтва, 2002.
4.Загадкі // Беларуская народная творчасць. — Мінск: Бел. навука, 2004.
5.Маляўка М. Сядзіба, або Хата з матчынай душою: Абразкі, вершы: для дзяцей малод. і сярэд. шк узросту / мастак Я. А. Ларчанка. — Мінск: Юнацтва, 2002.
6.Свяці, свяці, сонейка: творы беларускага фальклору // Бібліятэка беларускай дзіцячай літаратуры. — Мінск: Юнацтва,